# МЭТОДЫКІ АКТЫВІЗАЦЫІ Ў НАВУЧАНЬНІ

**(матэрыял для выкарыстаньня ў першы дзень варштатаў, падчас практычных заняткаў)**

*„ СКАЖЫ, Я ЗАБУДУ*
*ПАКАЖЫ, Я ЗАПОМНЮ*
*ДАЗВОЛЬ УЗЯЦЬ УДЗЕЛ, Я ЗРАЗУМЕЮ”*
(кітайская прыказка)

Традыцыйныя мэтодыкі навучаньня, якія выкарыстоўваліся да нядаўняга часу, ў асноўнай масе сваёй абапіраліся на асобе настаўніка, як выключнай крыніцы ведаў, у рэдкіх выпадках выкарыстоўвалася групавая праца. Найчасьцей гэта былі: інфармацыйная лекцыя, апісаньне, апавяданьне,рэфэрат ці размова. На сёньняшні дзень роля настаўніка зьмяняецца – з пазыцыі выкладчыка ён стаецца арганізатарам і каардынатарам працы вучняў, актывізуючы іх да творчых дзеяньняў. У падобным працэсе традыцыйных мэтодыкаў ужо не хапае.

Падрыхтоўка маладога чалавека да жыцьця ў грамадзтве, каторае заліваецца плынямі інфармацыі і кансумпцыі, зьяўляецца складанай задачай і вымагае актыўнага стаўленьня як ад настаўніка, так і ад вучня. Найбольш істотнаым, наўпрост вырашаючым фактарам для пазытыўнага стасаваньня мэтодыкаў, зьяўляецца камунікацыя паміж вучням і настаўнікам.

**МЭТОДЫКІ АКТЫВІЗАЦЫІ** – дапамога і падказкі, дзякуючы каторым вучань пашырае свае веды, паглыбляе свае зацікаўленасьці, разьвівае новыя ідэі, камунікуе з іншымі, вучыцца дыскутаваць і размаўляць на разнастайныя тэмы.

**Галоўным плюсам** такіх мэтодыкаў зьяўляецца тое, што яны палягаюць на ўдасканальваньні навыкаў, патрэбных ня толькі падчас урока, але гэтаксама і ў штодзённым жыцьці, нп. Здольнасьці да падвядзеньня вынікаў, аналітычна-крытычнага мысьленьня, злучэньня здарэньняў і фактаў ў прычынна-выніковыя зьвязы, здольнасьці да аб’ектыўных паводзінаў у новых сытуацыях, камунікатыўнасьці, дыскусіі, крэатыўнасьці.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

Стог Дале (піраміда запамінаньня):




*„Мэтодыкі, не зьвязаныя з мэтамі, зьместам, арганізацыйным дыяпазонам, а перадусім, з патрэбамі вучняў і перавагамі настаўнікаў, ня маюць вартасьці.”*

**Агульны падзел актывізацыйных мэтодыкаў:**

I. **Мэтодыкі праблемаў**, разьвіваюць здольнасьці крытычнага мысленьня. Палягаюць на прадстаўленьні вучням праблемнай сытуацыі і арганізацыі пазнаўчага працэсу. Пры гэтым выкарыстоўваюцца разнастайныя крыніцы інфармацыі, напрыклад дыдактычныя фільмы, фатаздымкі, малюнкі, Інтэрнэт, лічбаыя дадзеныя. Падобны пазнаўча-выхаваўчы працэс уключае ў сябе аналіз, тлумачэньне, ацэнку, параўнаньне і рабленьне высноваў. Прыкладамі такіх мэтодыкаў зьяўляюцца: “бура мазгоў”, назіраньне, панэльная дыскусія, мэтодыка праблемнага падыходу, выучэньне выпадковасьцяў.

II. **Мэтодыкі выразу і ўражаньня**, скіраваныя на эмоцыі і перажываньні. Дзякуючы ім павялічваецца эмацыйнае заангажаваньне вучняў. Гэта зьяўляецца эфэктам дасьведчаньняў і перажываньняў, зьвязаных з выкананьнем пэўных



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

заданьняў (нп. дыдактычная гульня). Прыкладныя мэтодыкі: драма, сымуляцыя, мапа мозгу, лябараторная мэтодыка, мэтодыка праекту.

III. **Мэтодыкі графічнага запісу,** пры ўжываньні каторых увесь працэс прыняцьця рашэньня прадстаўляецца пры дапамозе малюнкаў. Заахвочвае да самастойнага прыняцьця рашэньняў. Напрыклад: дрэва рашэньняў, рыбі шкілет, плякат, мэнтальная мапа, сьнежны ком, мапа асацыяцый.

**Падрабязны падзел мэтодыкаў:**

1. **Інтэграцыйныя мэтодыкі**– дазваляюць расслабіцца, рэляксуюць, падымаюць настрой і ствараюць зычлівую атмасфэру, забясьпечаюць бясьпеку ў групе, гарантуюць пачуцьцё самаідэнтычнасьці, вучаць эфэктыўнай камунікацыі.
2. **Мэтоды дэфініяваньня паняцьцяў**– мэтай ёсьць навука аналізаваньня і дэфініяваньня паняцьцяў, але таксама перамоваў і прыняцьця рознага кшталту падыходаў.
3. **Мэтодыкі гіерархізаваньня** – ставяць за мэту навучыць клясыфікацыі і падпарадкаваньню інфармацый у стасунку ніжэй-вышэй.
4. **Мэтодыкі творчага вырашэньня праблемаў** – вучаць крытычнаму і творчаму мысьленьню і спалучэньню ведаў з досьведам.
5. **Мэтодыкі працы ў супрацы** – вучаць супрацы і акцэптацыі індывідуальных розьніцаў, працы ў групе, разам з групай.
6. **Дыягнастычныя мэтодыкі**– палягаюць на зьбіраньні інфармацыі аб працяканьні і выніках акрэсьленага стану рэчаў.
7. **Дыскусыйныя мэтодыкі** – вучаць дыскусіі, прэзэнтаваньню ўласнага пункту гледжаньня.
8. **Мэтодыкі, разьвіваючыя творчае мысьленьне**– вучаць творчаму мысьленьню і адкрываньню сваіх здольнасьцяў.
9. **Мэтодыкі групавога прыняцьця рашэньняў** – аддаюць перавагу эфэктыўнаму ўдзелу ў дыскусіі і вучаць адказнасьці за свае і групавыя рашэньні, а таксама прыняцьцю рашэньняў на падставе пэўных фактаў.
10. **Мэтодыкі плянаваньня**– дазваляюць вучням плянаваць рэчаіснасьць, фантазіраваць, марыць і плянаваць рэалізацыю сваіх мараў.
11. **Дыдактычныя гульні** – вычаць саблюдаць правілы, шчыра радавацца з выйгрышу і прымаць паразы.
12. **Мэтодыкі паскоранага навучаньня**– хуткае засваеньне.
13. **Мэтодыкі падвядзеньня вынікаў**– дазваляюць праодзіць уласную ацэнку, ацэнку іншых, вучаць прымаць крытыку.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

**АПІСАНЬНЕ МЭТОДЫКАЎ**

**Анкета** – спосаб дасьледваньня зьяваў, збору інфармацыі на падставе адпаведна апрацаваных анкет, што ўключаюць у сябе пытаньні, датычныя акрэсьленай тэматыкі. Мэтай анкеты можа быць здабыцьцё інфармацыі аб стане ведаў удзельнікаў заняткаў, знаёмства з іх меркаваньнямі на акрэсьленую тэматыку і г.д. Параўнаньне і аналіз вынікаў зьяўляюцца вызначальнікам меркаваньня групы на дадзеныя тэмы. У залежнасьці ад спосабу атрыманьня адказу можна адрозьніць : пісьмовыя анкеты (удзельнік пісьмова адказвае на пастаўленае пытаньне), малюнкавыя анкеты (адказы прадстаўляюцца ў мастацкай форме) ,слоўныя анкеты (адказы даюцца ў вуснай форме). Атрыманыя інфармацыі могуць дапамагчы ўдзельнікаму атрыманьні больш глыбокіх ведаў на тэму ласных паводзінаў у акрэсьленых сытуацыях. Абапіраючыся на гэтыя веды, удзельнікі могуць прымаць рашэньні аб зьмене паводзінаў. Найчасьцей анкета складаеццаса сказаў-прыкладаў пэўных спэцэфічных рысаў паводзінаў, каторыя можна ацаніць. Утрымлівае ў сабе шкалу, каторая дазваляе удзельніку акрэсьліць і вымяраць адпаведнасьць адказу з межах кожнага сьцьярджэньня. У часе трэнінгаых сэкцый кожнае ыкарыстаньне гэтай мэтодыкі адбыаецца ў чатырох этапах:

1. Вядучы разае анкеты, чытае інструкцыі (удзельнікі чытаюць пра сябе).
2. Тэарэтычныя падставы - пасьля выкананьня анкет удзельнікамі, вядучы тлумачыць праілы, паводле якіх укладалася анкета, а таксама тлумачыць, што вымяраецца пры яе расшыфроцы.
3. Расшыфроўка вынікаў анкеты паводле шкаляў.
4. Інтэрпрэтацыя – зьўляецца карысным, каб удзельнікі заняткаў выпісалі свае пункты на асобных аркушах паперы. Вядучы выпісвае таксама сваю ласную пунктацыю, каб паказаць, якім чынам паінен выглядаць запіс. Удзельнікі дзеляцца на групы і дыскутуюць аб выніках.

Вядучы павінен таксама памятаць, каб:
- не тлумачыць, калі ўдзельнікі чытаюць фармулёўку анкеты,
- ня змушаць да адкрыцьця вынікаў,
- ня ставіць удзельнікам дыягназы іх слабасьцяў,
- паспрабаваць анкету найперш на сабе,
- заахочваць удзельнікаў да сумленнага і адкрытага падыходу да сьцьвярджэньняў з анкеты,
- зарэзэрваваць неабходную колькасьць часу на вылічэньне вынікаў,
- дапамагчы ўдзельнікам, каторыя маюць клопаты з нагоды неадпаведнасьці атрыманых і чаканых вынікаў.

**Тэле-, радыёпраграмы** – праграмы радыё, тэлебачаньня з каторымі знаёмяцца ўдзельнікі заняткаў.Можа несьці пэўныя зьместы, быць увядзеньнем у дыскусію, і г.д. Пера прэзэнтацыяй праграмы трэба патлумачыць, падрыхтаваць групу да інфармацыі,

сказаць, што ў дадзеным матэрыяле істотнае, на што ўдзельнікі маюць зьвярнуць увагу. Радыё- альбо тэлепраграму могуць падрыхтаваць і самі ўдзельнікі заняткаў. Дазваляе гэта на больш глыбокае знаёмства з матэрыялам, атрыманьне візуалізацыі праблемаў асяродзьдзя, каторае блізкае ўдзельнікам. (Нажаль, гэта мэтодыка забірае вельмі шмат часу і часта група канцэнтруецца на тэхнічных магчымасьцях абсталяваньня, а не на самой тэме).

**“Бура мазгоў” (брэйнстормінг)** – зьяўляецца супольнай дзейнасьцю, каторая палягае на ыкарыстаньні агульнай энэргіі групы для выпрацоўкі шырокага спэктру ідэяў-думак. Адначасова зьяўляецца спосабам групавога пошуку найлепшага рашэньня праблемаў. Брэйнстормінг аказваецца посьпехам тады, калі ў ім бяруць актыўны удзел усе ўдзельнкі, пачынаючы ад першых ацэнак і меркаваньняў і да стварэньня канчатковага сьпісу ідэяў для далейшых супольных рашэньняў. Найлепшыя эфекты асягаюцца ў групах, меншых за 10 асобаў. Сэсію найлепш праводзіць у маленькіх памяшканьнях, дзе на сьцены будуць вешацца плякаты з запісанымі ідэямі.Час працэдуры сьцісла акрэьслены і кантраляваны.

Тыповы брэйнстормінг складаецца з пяці этапаў:

1. Увядзеньне праблематыкі – вядучы запісвае праблему. Праблема мае быць акрэсьленая каротка, ляканічна, быць сьціслa акрэсьленая, стымулюючая (нп. „ як сёньня выразіць патрыятызм? “) Вядучы тлумачыць, чыму на сёньняшні дзень гэтая праблема актуальная.
2. Прыгадваньне сабе правілаў падаваньня прапановаў вырашэньня праблемы.
3. Запісваньне прапановаў удзельнікаў па вырашэньні праблемы. Ідэі запісваюцца так, як падаюцца ўдзельнікамі, у большых групах можа быць дзьве запісваючыя асобы.
4. Калі час ужо дабянае канца, вядучы просіць задаваць пытаньні да аўтраў ідэяў, але выключна ля дадатковага вытлумачэньня. Толькі асоба, каторая падала ідэяю ўпаўнаважаная да яе тлумачэньня.
5. Удзельнікаў просяць аб ацэнцы іэяў, выбіраюцца найбольш абяцаючыя прапановы, зьяўляюцца спробы дамовіцца аб пазыцыях.

Умовы паачы прапановаў:

- чым больш прапановаў, тым лепш,
- не ацэньваць,
- кожны можа падааць прапановы для вырашэньня праблемы,
- у адным выступе можна падаць толькі адну,
- падавай усе прапановы, што тпрыйуць табе ў галаву, нават тыя, каторыя падаюцца банальнымі, абсурдальнымі альбо глупымі – мадыфікацыя ідэяў.

**Бура мазгоў 635-** гэта пісьмовы брэйнстормінг, дазваляе зактывізаваць нават найбольш нясьмелых. Служыць для знаходжаньня найлепшага рашэньня праблемы.Кожны

атрымлівае аркуш паперы, падзелены на 6 галоўных частак, кожная галоўная частка падзеленая яшчэ на 3. .

Умовы падаваньня прапановаў:
- торчая праца адбываецца пісьмова ў 6-асабовай групе. Кожная асоба мае напісаць 3 прапановы вырашэньня пастаўленай праблемы ў асобныя рубрыкі цягам 5 хвілінаў (адсюль 635),
- пасьля кожны перадае свій фармуляр суседу і так што 5 хвілінаў кожны ўпісвае 3 прапановы, пакуль фармуляры цягам 30 хвілінаў не абыйдуць усіх удзельнікаў групы,
- Ідэяў ужо раз напісаных (намі альбо калегамі) нельга паўтараць, яны мусяць быць албо новымі, албьо разьвітымі з папярэднянапісаных.
- Можна пісаць цалкам нерэальныя , фантастычныя, а нават "вар'яцкія" ідэі. Нельга накладаць сабе аніякіх абмежаваньняў. (падчас выконваньня групай заданьня, варта прыгадаць, каб не паўтаралі ўжо запісаных думак і карысталіся натхненьнем калегаў) . Пасьля сканчэньня сэсіі прапановаў трэба зрабіць кароткі перапынак, пасьля каторага наступіць прэзэнтацыя ідэяў (рашэньняў не ацэньваем). Наступным этапам зьяўляецца пераправерка ідэяў і выбар аднаго рашэньня.

**Практыкаваньне** – дзеяньне выконваецца з мэтай навучаньня якому-небудзь навыку, усьведамленьня пэўных зьменаў, перажыцьця пэўных станаў.

**Дэманстрацыя** ⇨ паказ

**Дыяграма** – малюнкавае прдстаўленьне якой-небудзь залежнасьці паміж двума (некалькімі) вялічынямі. Пры дапамозе дыяграмы можна прадставіць вынікі дасьледаваньняў, праведзеных у групе. Можа мець розныя формы. Найпрасьцейшыя дыяграмы: слупковая, колавая. Падрыхтаваная вядучым, можа служыць як візуальная дапамога. Выкананая ўдзельнікамі заняткаў, дапамагае ім на адкрыцьцё залежнасьцяў , глыбейшы ўваход у тэматыку, упарадкаваньне пэўных дадзеных, лепшае запамінаньне тэмы.

**драма** – гэта "практыкаваньне жыцьця". Гэта фікцыйная, уяўленая сытуацыя, у каторай некалькі асобаў ўяўляе штосьці, што не зьяўляецца рэальным у адзеным часе, пры гэытым ужываючы як сродак выразу уласнае цела і голас. Драмаа будзіць і разьвівае натуральныя сьхілнасьці чалавека, зьвязаныя зь яго здольнасьцямі "ўваходжаньня ў ролю", мае перад сабою мэту научаньня самастойнасьці ў мысьленьні і дзейнасьці, а так сама аткрытага і актыўнага стаўленьня, пашырэньня шкалы эмацыйнага адчуваньня, узбагачэньня ваабражэньня.
Этапы:
1. Уступ – пошук суплоьнай ля групы тэмы, выбраньне асобаў на ролі.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

2. Выкананьне сцэны.
3. Абмеркаваньне ўдзелу гульцоў у гульне, іх адчуваньняў, сувязяў паміж зьместам драмы і іх уласнымі праблемамі, інтэрпрэтацыя павозінаў, выказваньняў.
Сцэнскі зьяўляюцца асканалай мэтодыкай тады, калі мы хочам, каб удзельнікі:
-паставілі сябе на месца іншай асобы, каб спрабавалі зразумець думкі і пачуцьці, якія дадзеная сытуацыя ў кімсьці нараджае,
- паспрабавалі новыя спосабы паводзінаў,
- даведаліся, як іншыя і яны самі рэагуюць на розныя стаўленьні і паводзіны ў канкрэтных сытуацыях,
- прынялі на сябе рызыку новых спосабаў паводзінаў у бясьпечнай сытуацыі, бязь непакойю перад памылкай ці рэальнымі нэгатыўнымі наступствамі.
Дзеля таго, каб псыхадрамы мелі сэнс, варта памятаць, каб удзельнікі выконвалі свае ролі, абапіраючыся на ўласны досьвед, каб сытуацыі, каторыя яны граюць мелі сувязь з іх рэальнымі праблемамі. Кожная драма павінная быць даклана абмеркаваная.

**Дыскусія** – абмен меркаваньнямі, каторыя адлюстроўваюць погляды ўдзельнікаў на дадзеную тэму. Яе характэрнай рысай зьяўляецца рознастайнасьць поглядаў, у спалучэньні са спробай пошуку правільнай пазыцыі, што пасавала б да прыняцьця абодвума бакамі. Дыскусія дазваляе на глыбейшае разуменьне праблемы, вучыць займаць пэўныя пазыцыі, карыстаньня з аргумэнтаў, вучыць зьвяртаць увагу на меркаваньне іншых, стабілізуе ўласныя перакананьні і погляды на сьвет. У залежнасьці а ролі, якую адйграе ў іх вядучы, дыскусіі адбываюцца ў, як найменш, трох розных варыянтах: кіраваная дыскусія, зарганізаваная і свабодная. У кіраванай дыскусіі вядучы выконвае актыўную ролю, уплывае бяспасярэдне на яе цяг. Кіраваная дыскусія будзіць лягічнае мысленьне, вымагае ад вядучага глыбокіх ведаў, зьвязаных з тэмай.
У зарганізаванай дыскусіі вядучы дазваляе ўдзельнікам на яе вядзеньне, але пры ўмове, што яны будуць прытрымліватца створаных імі жа правілаў і працэдур. У свабонай дыскусіі дапускаецца яе спантанічная форма, усталёўваецца толькі тэма, а аб форме і цягу дыскусіі прымаюць рашэньне ўдзельнікі. Зарганізаваная і свабодная дыскусія будзяць актыўнасьць ўдзельнікаў, дапамагаюць ім у дасяганьні ўпэўненасьці ў сабе і набіраньні большага даверу да групы. Праз супольныя пошукі і адкрыцьці ўдзельнікі атрымліваюць погляды, каторыя сапраўды зьяўляюцца іх уласнымі поглядамі, а таксама давер да сябе саміх, каторы вынікае з дасягненьня гэтых поглядаў.

**Дыскусія 2x4x8** - вырашэньне праблемы шукаецца ў парах, пасьля ў чацьверках, каторыя дыскутуюць на тую ж самую тэму.Часьверкі аб'ядноўваюцца ў васьмёркі і дыкутуюць далей, а пазьней прадстаўляюць супольны пагляд.

**Клясычная дыскусія** – вядучы дае тэму дыскусіі, перадае права голасу, падсумоўвае дыскусію (упарадковае аргумэнты, паказвае магчымасьці вырашэньняў).



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

**Ланцуговая дыскусія** – вядучы просіць, каб усе аб паанай паданай праблематыцы выказаліся па чарзе, адзін за ругім, так як сядзяць побач сябе. Кожны мае абавязак выказацца. Можна абмежаваць колькасьць сказаў і час выказваньня, альбо наадварот, параіць выказвацца цягам акрэсьленага часу.

**Дыскусія круглага стала** – свабодны абмен поглядамі паміж партнэрамі з ідэнтычнай ступеньню ведаў на дадзеную тэматыку. Адной з галоўных умоваў дыскусіі круглага стала зьяўляецца шчырасьць у абмене поглядамі. Удзельнікі ня толькі абмяркоўваюць праблему, але таксама абдумваюць аргумэнты, прадстаўленыя іншымі дыскутантамі.

**Панэльная дыскусія -** дыскусія з назіраньнем – характэрызуецца тым, што ў першай фазе выказваюцца запрошаныя спэцыялісты, а толькі ў ругой частцы ыскусія пераходзіць таксама на ўдзельнікаў.

**Дыскусія "пустое крэсла"** – на плякатах азначаныя тры розныя меркаваньні на гэтую тэму (два скрайнія, адно зьяўляецца пасярэднім голасам). Удзельнікі знаёмяцца з меркаваньнямі і групуюцца ля плякатa, каторы цалкам ці часткова адпавядае іх погляду. Для асобаў, што ня могуць сябе аднесьці да якойкольвек групы, ёсьць чацьверты плякат са знакам пытальніка. Пасьля кароткай размовы ў сваіх групках, кожная зь іх дэлегуе свайго прадстаўніка на плэнарнае паседжаньне. Дэлегаты сядаюць на чатырох крэслах і вядуць дыскусію, група пDelegaci siadają na czterech krzesełkach i prowadzą dyskusję. Ава голасу ня мае, адзінае, калі хтосьці хоча сесьці ў "пустое крэсла", падрыхтаванае для гэтай мэты. Атрымаўшы згоду вядучага, такая асоба сядае ў крэсла, далучаецца да размовы і па кароткім часе вяртаецца да групы.

**Дыскусія "суд над поглядам"** – пасярод удзельнікаў заняткаў выбіраем судзьдзю, абаронцаў, пракурораў, лаву прысяжных. Судзьдзя тлумачыць праблему. У групах адбываюцца нарады, падрыхтоўваюцца прамовы абаронцаў і пракурораў, бакі зьбіраюць аргумэнты. Падчас падрыхтоўкі бакоў судзьдзя вядзе справу, дае права выказацца зацікаўленым бакам, запрашае сьведкаў. Пракуроры і адвакаты стараюццанадзейнай аргумэнтацыяй даказаць слушнасьць ці няслушнасьць тэзы. Пасьля выслуханьня бакоў лава прысяжных сыходзіць на абмеркаваньне і выносіць вэрдыкт. Судзьдзя агучвае рашэньне.

**Дыскусія "сонейка"** –гэта форма дыскусіі, у каторай удзельнікі напачатку прадстаўляюць свае меркаваньні на аркушах паперу (кожнае меркаваньне на асобным). Пасьля укладаюць па колу, пры гэтым тыя, што паўтараюцца ўкладаем так, каб яны утварылі праменьні сонейка.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

**Эстафэтная дыскусія** – пасьля сфармуляваньня праблемы, глас атрымлівае асоба, абраная вядучым. Пасьля сканчэньня свайго выступу яна перадае голас наступнай, выбранай праз сябе, асобе. Гэтая форма дыскусіі прыдатная тады, калі нам залежыць на тым, каб пачуць меркаваньне ўсіх удзельнікаў.

**Дыскусія ў часавым стрэсе** – вядучы акрасьляе правілы дыскусіі: нельга дапусіціць, каб яна трывала даўжэй за 10-15 сэкунд, цішыню належыць запаўняць адказамі, найлепш спантанічнымі. А калі яны скончыацца і пагражае цішыня, то павінная выказвацца асоба, што сядзіць па правым баку ад таго ўдзельніка, што выказваўся апошнім.

**Дыскусія ў групах (шматступнёвая)** - на пачтаку група падзеленая на маленькія падгрупы, паміж імі адбываецца абмен досьведам, меркаваньнямі, увагамі і г.д. Пасьля падгрупы прадстаўляюць вынікі сваёй працы і адбываецца ыскусія на гэтую тэму.

**Ізаляваная дыскусія** - група сядае ў двух колах: ва ўнутраным коле сядаюць дыскутанты, у зьнешнім- назіральнікі. Такім чынам можна зактывізаваць пасыўных удзельнікаў заняткаў (садзячы іх у сярэзіне кола) і суцішыць асобаў, што рэгулярна забіраюць голас (яны займаюць месца ў вонкавым коле).

**Дыскусія за плячыма** - гэты спосаб выкарыстоўваем падчас ацэнкі стаўленьня ці працы кагосьці.Асобу, каторую ацэньваюць, сазім у крэсьле, сьпінаю да ўсіх і просім прыслухівацца а дыскусіі ў маўчаньні. Рэшта ўдзельнікаў выказваецца за плячыма гэтай асобы. Падобную форму дыскусіі належыць ужываць досыць рэдка, паколькі варта вучыць людзей выказвацца на складаныя тэмы, ясна і сьмела выказваць свае думкі, вучыцца выслухоўваць увагі і пазытыўныя ацэнкі. Гэтая тэхніка прыдатная ў выпадку, калі асоба мае сьхільнасьці ля гарачага ўдзелу ў дыскусіі, уключэньня ў яе да таго часу, пакуль абвінавачваньні бууць пацьверджаныя аргумэнтацыяй, апраўданьняў сваіх паводзінаў, ськіваваньня ўвагі дыскутантаў на іншыя праблемы албо мае складанасьці з прыняцьцём пахвалы. “Гэрой” сустрэчы уключаецца ў дыскусію толькі тады, калі ўжо будуць выказаныя ўсе ацэнкі.

**Экспэрымэнт** – мэтодыка дасьледваньняў, каторай падставовай часткай зьяўляецца ўяўненьне якога-небудзь працэсу альбо рэгуляваньне ўмоваў, на яго ўплываючых, каб зрабіць магчымым яго дакладнае дасьледаваньне.Падчас правядзеньня экспэрымэнту ўдзельнікі дакладней даведваюцца аб працэсе, знаходзяць залежнасьці, каторыя ў ім праяўляюцца.

**Фабула (гісторыя)** ⇨ забава з гісторыяй.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

**Гульня** – форма забавы паволе пэўных правілаў. Мэтай гульні не зьяўляецца перамога, а навучыцца, перажыць, узбагаціць свій осьве, пазнаць пэўныя новыя мэханізмы, зьместы.

**Гульня-рашэньне** – мэтай гульні ёсьць навука прыняцьця апавеных рашэньняў, даходжаньня да супольных меркаваньняў. Сытуацыя акрэсьленая, ролі асобаў у ёй таксама**.**

**Гульня з кіраваньнем –** дапамагае ў назіраньні за паводзінамі асобаў ў групах, дадае ведаў аб сабе самым. Група выконвае пэўнае заданьне (плянуе, рэалізуе, ацэньвае), пасьля чаго прыглядаецца да ўзаемастасункаў, паводзінаў, стыляў кіраваньня..

**Настольная гульня -** заданьнем удзельнікаў (альбо груп) зьяўляецца прайсьці трасу, дайсьці да мэты (рухаемся па гульнявым полі пры дапамозе фігурак і гульнявых костак). Падчас дарогі належыць выканаць пэўныя заданьні. Гульня дапамагае спраўдзіць стан ведаў ўдзельнікаў, іх навкі. Дапамагае ўпарадкаваць і ўмацаваць набытыя інфармацыі. Гуляць можна групай альбо індывідуальна.

**Колавая картка-** мэтодыка, як дайсьці да ідэі на вырашэньне праблемы. На карты намаляване кола, падзеленае на чацьвярціны. Кожная чацьвярціна – гэта адно пытаньне-крок у дарозе да рашэньня праблемы.

1. Праблема – што ня добра? Якія сымптомы? Што мне перашкаджае ў параўнаньні з жаданай сытуацыяй?
2. Аналіз. Трэба выканаць дыягностыку праблемы, падзяліць сымптомы на катэгоры, знайсьці прычыны. Падумаць над тым, чаго не хапае. Акрэсьліць перашкоды на дарозе вырашэньня праблемы.
3. Падыход. Якія магчымыя стратэгіі ці рацэпты? Якія тэарэтычныя лекі? Апрацаваць канкрэтныя прапановы.
4. Прапановы дзеяньня. Што можна зрабіць. Якія канкрэтныя крокі, каб даць сабе рады з праблемай?

Карта спрыяе пакрокаваму рашэньню праблемы. Адна добрая ідэя можа гэнэраваць наступныя.

**Мэтодыка інсцэнізацыі** – удзельнікі заняткаў мусяць вырашыць канкрэтную праблемную сытуацыю, граючы атрыманыя ролі. Інсцэнізацыя вучыць розным спосабам паводзінаў, суперажываньню, усьведамленьню наступстваў прынятых рашэньняў. Граньне ролі вяжацца з запрашэньнем удзельнікаў да прыняцьця характару альбо пэўных рысаў характару постаці, а таксама выразу іх у размове і паводзінах,

каторыя б мелі месца, “калі б” удзельнік быў гэтай асобай. У практыкаваньні выконваньня роляў навучэнцы вучацца праз дзеяньне. Гэта дазваляе ім на:
- дасьлеваньне, як можна выкарыстаць дадзеную сытуацыю,
- павязаньне думак і рашэньняў ў больш сьціслую сувязь з канкрэтным дзеяньнем,
- магчымасьць зьмены свайго стаўленьня,
- практыкаваньне кантролю над сваімі пачуцьцямі і эмоцыямі.
Існуе вялікі шанец на перанясеньне новага стаўленьня і паводзінаў, дасьведчаных у часе занятка на сытуацыі, што зьяўляюцца ў рэальным жыцьці.
Прыкладная схэма інсцэнізацыі выглядае наступным чынам:
1. Вядучы апісвае сытуацыю і ўдзельнікаў здарэньня.
2. Удзельнікі атрымліваюць свае ролі.
3. Граюць сцэнку (нп. гэта найграецца на відэа).
4. „Акторы” камэнтуюць, чаго навучыліся на падставе згулянай сцэнкі.
5. Усе ўдзельнікі заняткаў абменьваюцца досьведам.
Інсцэнізацыю можна спалучыць з аналізам здарэньняў (⇨ мэтоыка здарэньня).

**Мэтодыка здарэньня** – гэта мэтодыка пошуку рашэньня ў крытычныях сытуацыях, прадстаўленых у пісьмовай форме аб складаных для вырашэньня праблемах, с каторымі маюць удзельнікі сутыкненьні ў сваёй працы.У адрозьненьне ад сытуацыйнай мэтодыкі, у каторай выступаюць часьцей сытуацыі оўгія і шмат аспэктныя, сытуацыі крытычныя – кароткія, канцэнтруюцца вакол спэцыфічнай, выбранай праблемы і апрацаваныя так, каб падкрэсьліць іх стасункі да аднаго з прынятых курсаў заняткаў. Паколькі датычацца рэальных праблемаў, дыскусія аб іх мае выключную адукацыйную вартасьць. Удзельнікі могуць самі падрыхтаваць апісаньні крытычных сытуацый (асобам, што рыхтуюць апісаньні раіцца не тлумачыць, як праблема была вырашаная – калі яна нейкім чынам вырашылася, наступстваў гэтага, альбо наступстваў нязробленых дзеяньняў). Пасьля знаёмства з крытычнай сытуацыяй удзельнікі задаюць пытаньні ля больш поўнага выясьненьня праблемы, дыскутуюць на тэму дзеяньняў албо рашэньняў, каторыяпадаюцца ўласцівымі для дадзенай сытуацыі, выбіраюць набольш адпаведнае рашэньне. Калі працэдура сканчваецца, асоба, каторая прастаўляе сытуацыю, тлумачыць, як выглядае рэальны стан рэчаў. Удзельнікі таксама могуць атрымаць ад вяучага апісаньне сытуацыі. Незалежна ад формы і спосабу прэзэнтацыі, мэта тая ж самая – стварыць умовы дзеля таго, каб удзельнікі дайшлі, на падставе прадстаўленых фактаў, да пэўных вынікаў, каторыя можна аднесьці а іх уласнай сытуацыі. Звычайна мэтодыка здарэньня рэалізуецца ў двух этапах:
1. Удзельнікі атрымоўваюць на прачытаньне апісаньне сытуацыі.
2. Удзельнікі дыскутуюць над прадстаўленай сытуацыяй, супольна даходзяць да меркаваньня, як трэба паступіць.
Калі апісаньне ня было поўнае, то вядучы можа пытаньнямі матываваць групу да дыскусіі. Магчымая таксама такая сытуацыя, што ўдзельнікі мусяць атрымаць дадзеныя

для рашэньня праблемы, сьціроўваючы пытаньні да пэўных асобаў, каторыя, паводле іх меркаваньня, могуць высьветліць сытуацыю (пытаньні запісваюцца на паперы з паданьнем адрасата, адказвае (таксама пісьмова), вядучы заняткаў). Удзельнікі вучацца тады шукаць аказаў на пытаньні, каторыя дазвалюяць на лепшае пазаньне праблемаў, іх прычынаў.
Галоўнай мэтай падобнай мэтодыкі зьяўляецца звальненьне ўдзельнікаў ад занадта моцнай залежнасьці ад паручнікаў праз трэніроўку і разьвіцьцё навыкаў самастойнай ідэнтыфікацыі, аналізу ацжнкі і рашэньня праблемаў, набыцьцё навыкаў устрыманьня пера выкананьнем хуткіх ацэнак людзей і паводзінаў, перад пошукам аднаго "найлепшага адказу". Гэтая мэтодыка таксама паказвае, што тыя самыя здарэньні бываюць па рознаму прынятыя людзьмі – у залежнасьці ад багажу іх досьведу.

**Сытуацыйная мэтодыка** – гэтая мэтоыка служыць для фармаваньня ў удзельнікаў заняткаў здольнасьцяў на ўсебаковы аналіз шматаспэктных праблемаў ( у адрозьненьне, ад мэтодыкі здарэньняў, у каторых аналізуюцца аднааспэктныя праблемы), з каторых складаюцца т.зв. складаныя сытуацыі, а таксама прыняцьця на гэтай падставе адпаведных рашэньняў і указаньня магчымых наступстваў пачынаньняў, зьвязаных з гэтымі рашэньямі. Удзельнікі перад заняткамі знаёмяцца з апісаньнем сытуацыі і рэкамэндаванай літаратурай. На занятках усталёўваюць істотныя факты і акалічнасьці, фармулююць праблему. Акрасьляюць крытэрыі рашэньня праблемы, дыскутуюць над праблемай паволе прынятых крытэрыяў, ацэньваюць канкрэтныя прапановы рашэньняў. Ад мэтодыкі сымуляцыйнай адрозьніваецца тым, што аносіцца найчасьцей да сытуацый фікцыйных, хоць і цалкам верагодных.

**Намінальны групавы працэс** – гэта спосаб групавога вырашэньня праблемаў. У сустрэчы бярэ удзел 1-5 груп з колькасьцю удзельнікаў 5-9 чалавек. Вядучы распачынае сэсію падаючы мэту сустрэчы, тлумачыць уклад кожнага з узельнікаў у яго рэалізацыю і акрасьляе, як будуць выкарыстаны вынікі сэсіі.Праца ў групах зеліцца на шэсьць этапаў:
1. Чальцы групы думаюць самастойна (але ў тым самым памяшканьні), запісваюць свае ідэі (найлепш кожную на асобным аркушы).
2. Запісаньне па чарзе прапановаў (канкрэтныя прапановы- па адной- прапаноўваюць усе чальцы групы. Працэдура паўтараецца ажно да запісаньня ўсіх прапноваў).
3. Дыскусія, каторая канцэнтруецца на вытлумачэньні значэньня прапановаў, а не на іх прыняцьці альбо адкідваньні.
4. Уступнае галасаваньне над прыдатнасьцю ідэяў – кожны ўдзельнік выбірае 5 прапановаў, вядучы зьбірае лісты, падлічвае галасы і запісвае атрыманыя вынікі.
5. Дыскусія над вынікамі галасаваньня.
6. Апошняе галасаваньне (таксама таемнае). Абвяшчэньне вынікаў.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

Групы прадстаўляюць апрацаваныя прапановы, пасьля дыскутуюць і выбіраюць найлепшую.

**Назіарньне** – мэтодыка дасьледваньняў, што паляган на плянавым і сыстэматычным аналізаваньні фактаў, прыгляданьню да чагосьці. Перад правядзеньнем назіраньня неабхона падаць яе мэту, акрэсьліць, на што трэба зьвярнуць увагу.

**Выкананьне ролі**⇨ мэтодыка інсцэнізацыі

**Апавяданьне** – Удзельнікаў заняткаў азнаёмліваюць з акрэсьленымі рэчамі, зьявамі, здарэньнямі альбо працэсамі ў форме іх слоўнага апісаньня. Зьмест апавяданьня мусіць быць прывязаны да досьведу ўдзельнікаў, адначасова пашыраючы і ўзбагачаючы яго новымі элементамі.

**Пантаміма** – нямое сцэнічнае відовішча, у каторым зьмест пераказваецца акторамі выключна пры дапамозе рухаў цела, жэстаў і мімікі. Пантаміму можна выкарыстаць на увядзеньні ў тэматыку, альбо напрыканцы заняткаў.

**Перафразаваньне**- кожная асоба можа выказацца толькі пасьля перафразаваньня ідэі і пачуцьцяў папярэдняга размоўцы як мага больш дакладна іxkażda osoba może wypowiadać się dopiero po uprzednim przeformułowaniu idei i odczuć poprzedniego rozmówcy w перадаючы і пры гэтым, каб задаволіць іх аўтара. Удзельнікі дзеляцца на пары і дыскутуюць на спрэчную тэму. Спачатку выказваецца асоба А, потым асоба Б перафразоўвае яе выказваньне (нп. пачынаючы ад словаў "Інакш кажучы,..", "Калі я добра цябе разумею,..", "Сьцьвярджаеш, што…") - прыводзіць сваімім словамі пачутае меркаваньне і толькі потым пераходзіць да выказваньня ўласнага меркаваньня.. Іншая форма гэтай мэтодыкі – спосаб на простае, але дакладнае запамінаньне тэксту. Атрымальнік, пасьля прачытаньня часткі альбо цэлага тэксту, мусіць яго перадаць іншай асобе, каторая яго перафразоўвае сваімі словамі.

**Дошка**- дошка з малюнкам, фатаздымкам і г.д., каторыя адатычацца акрэсьленай тэматыкі. Робіць магчымым вобразнае запамінаньне зьместу і існуючых у ім сувязяў. Дошка можа быць падрыхтаваная вядучым, выкананая вядучым падчас занятку (стварэньне схэмаў са ступеньню павелічэньня колькасьці інфармацыі), выкананая ўдзельнікамі заняткаў.

**Гутарка**- размова вядучага заняткі з іх удзельнікамі, змушае да самастойнай мысьленчай дзейнасьці. Вядучы ў гэтай размове зьяўляецца кіруючай асобай, каторы ідзе да вядомай сабе мэты. Ставіць удзельнікам сэрыю лягічных пытаньняў, на



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

каторыя яны ў сваю чаргу даюць адказы. Гутарка дапамагае пры ўмацаваньні атрыманага матэрыялу.

**Поле моцы** – гэтая мэтодыка служыць для аналіза фактараў, каторыя могуць дапамагчы альбо перашкозіць у рэалізацыі якога-небудзь заданьня. Першапачаткова ўдзельнік адказвае на пытаньне: што перашкаджае яму ў рэалізацыі заданьня, пасьля сьцьвярджае, як гэта магчыма зьмяніць альбо выкарыстаць.

**Паказ -**(дэманстрацыя) прэзэнтацыя натуральнх прадметаў албо іх мадэляў, а таксама акрэсленых зьяваў, здарэньняў, навыкаў альбо працэсаў з іх обрым тлумачэньнем.
Мае месца таксама тады, калі хтосьці паказвае, як трэба рабіць. Розум удзельніка заняткаў зграмаджае інфармацыю, кажучы аб тым, як гэта было зроблена, аначасова з тым, як вочы назіраюць выкананьне гэтага дзеяньня. Пазьней розум ангажуецца ў спробе паўтарэньня таго, што назіралася. Добры паказ акрэсленых навыкаў вымагае добрай падрыхтоўкі. Вядучы пачынае прыняцьцё рашэньня аб падзеле дзеяньня на этапы, за каторымі ўдзельнікі павінныя назіраць.

**Параўнаньні** – гэтая мэтодыка зьяўляецца прыкладам аналітычнага пошуку ідэяў. Як тэхніка, яна служыць да адкрыцьця зьменаў канкрэтных рысаў прадукту (сыстэмы) праз параўнаньне з прадуктам (сыстэмай), што выконвае падобныя функцыі альбо зьяўляецца блізкім па канструкцыі, тэхналёгіі альбо матэрыялу. Напрыклад, прааўнаньне прапановаў са школьных праграмаў для вучняў амэрыканскіх і польскіх.

**Праца з тэкстам** – спосаб пазнаваньня і фіксацыі новых інфармацыяў. Прадметам самастойнай працы можа быць праца з тэкстам, пошук адпаведных фрагмэнтаў, пошук адказу на пытаньні, аргумэнтаў за і супраць, пераказ поглядаў аўтара.

**Мастацкая праца** – выкананьне удзельнікам альбо групай удзельнікаў мастацкай працы ў пэўнай тэхніцы можа служыць дапамогай пры ўвядзеньні новай тэматыкі, азнаямленьню з меркаваньнямі, падсумаваньні заняткаў. Асабліва раіцца выкарыстоўваць мэтодыку каляжу - працы, што палягае на спалучэньні розных матэрыялаў, элемэнтаў часопісаў, газэт і г.д.

**Пытаньні і адказы -** гэтая мэтодыка стымулюе размовы і ўзаемакамунікацыю. Пытаньні прыдатныя для акрасьленьня таго, што людзі хочуць ведаць, якія іх зацікаўленьні, што яны хочуць зрабіць з новаатрыманымі навыкамі і паводзінамі. Можа быць выкарыстаная спантанічна да бэспасрэднай перадачы інфармацыі, можна таксама яе залічыць да катэгорыі інструмэнтаў анкеты, каторыя даюць магчымасьць сабраць усе неабходныя дадзеныя.
Задаючы пытаньні, вядучы павінен памятаць аб некалькіх правілах:

- Плянаваць пытаньні, не кідаць іх выпадкова, мець сьвядомасьць, навошта задаецца менавіта гэтае пытаньне (ці гэта пытаньне для сабраньня меркаваньняў – "як мяркуеш, які ёсьць плян?" ці для атрыманьня інфармацыі- "як выкарытаць гэты плян?" ),
- Задаваць кароткія і простыя для зразуменьня пытаньні.
- Пазьбягаць задаваньня пытаньняў, на каторыя можна аказаць толькі "так" альбо "не" (т.зв. закрытыя пытаньні) і пытаньняў прапануючых адказ.,
- Ськіроўваць пытаньні да ўсёй групы, задаючы пытаньне не глядзець на канкрэтнага ўдзельніка, утрымліваць зрокавы кантакт з адказваючым.
-Пільнаваць, каб аказ не адыходзіў ад тэмы.

**Стасункі з пераказваньнем** ⇨ перафразаваньне

**Размова** – свабодны абмен меркаваньняў паміж вядучым і ўдзельнікамі заняткаў, мае на мэце дасьледваньне ўзроўню ведаў, меркаваньня на дадзеную тэму, абмен досьведам і г.д.

**Кола-** гэта мэтодыка, у каторай кожны па чарзе у коле выказваецца на адзеную тэму, выказвае сваё меркаваньне, сканчвае пачаты вядучым сказ. Падчас кола усе слухаюць, ніхто ня робіць аніякіх заўвагаў (вядучы таксама). Калі хтосьці выказаў нешта, што патрабуе абмеркаваньня, то трэба пачакаць з гэтым да канца кола. Кожны можа адмовіцца выказвацца, калі прыйдзе яго чарга і гэта ня мусіць быць камэнтаванае.

**Сэмінар-** служыць сыстэматызацыі ведаў удзельнікаў, каторая была атрыманая перад заняткамі пры дапаозе апрацоўкі адпаведнай літаратуры. Вядучы заўсёды мае загадзя акрэсьліць праблематыку, каторая будзе абмяркоўвацца, пааць ьэматыку заняткаў і мэту, якую хоча на іх дасягнуць.

**Вулічнае апытаньне** – спосаб пошуку аказаў, каторы палягае на апытаньні шырокіх колаў грамадзтва, што яны мяркуюць на цікавячую нас тэматыку.

**Сустрэча з экспэртам** – сустрэча з прафэсіяналам у адзенай галіне (альбо асобай, каторая будзе "граць" гэтага прафэсіянала). Удзельнікі павінныя падрыхтавацца да гэтай сустрэчы, ведаць тэматыку сустрэчы, падрыхтаваць пытаньні.

**Супэрпазыцыя** - гэта спосаб пошуку ідэяў, каторы палягае на спалучэньні дзьвух і болей абьектаў (зьяваў, працэсаў), дзяля таго, каб пасьля мадыфікацыі атрымаць новы абьект. У гэтай мэтодыцы сьвядомым і змушаным спосабам стасуецца зьява бісацыяцыі (спалучэньня двух розных элемэнтаў). Цыкл пошуку ідэяў з дапамогай гэтай мэтодыкі складаецца з чатырох дзеяньняў:
1. Пошук абьекту выхаду – што хочам атрымаць.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

2. Стварэньне асацыятыўных абьектаў (найменш 10).
3. Правядзеньне супэрпазыцыі – спалучэньня ў думках некалькіх асацыяцый, стварэньне новай пазыцыі.
4. Апрацоўка варыянтаў вырашэньня на падставе вынікаў супэрпазыцыі.

**Сымуляцыя** – прадстаўленьне акрэсьленага, знаёмага ўдзельнікам заняткаў, фрагмэнту рэчаіснасьці. Праз стасаваньне сымуляцыі зьмяшчаем удзельнікаў заняткаўда ўсебаковага аналізу разнастайных праблемаў, каторыя калісьці былі для кагосьці рэальнымі праблемамі. Гэтая мэтодыка дазваляе на атрыманьне досьведу ўдзелу ў праблеме, каторая абмяркоўваецца і навучаньню на яе прыкладзе з мінімальнай прафэсійнай і асабістай рызыкай, албо ўвогуле без такой рызыкі. Удзельнікі могуць ва ўмовах трэнінгу спрабаваць новыя стылі і спосабы дзейнасьці, а таксама ацаніць, якія моманты, вынікаючыя з прастаўленых сытуацый, зьяўляюцца для іх істотнымі.

**Крытычныя сытуацыі** ⇨ мэтодыка здарэньняў.

**С-Г-С – самастойна- у групе –самастойна- мэтодыка рашэньня праблемаў.**
Этапы:
1. Самастойная праца – вывучэньне літаратуры, пошук інфармацыі, стварэньне сьпіску рашэньняў.
2. Групавая праца – карыстаньне з парадаў спэцыялістаў, кансультантаў, пошук найлепшых ля іх рашэньняў.
3. Самастойная праца, выбар спосабу рашэньня праблемы.
Умовай посьпеху пры правядзеньні гэтай мэтодыкі зьяўляецца ўменьне працы з кансультантам, карыстаньня з парадаў, не прывязваньня да першых рашэньняў.

**Табліцы** – графічная форма пэўных зьместаў у аккрэсьленым парадку, найчасьцей на акркушы, паволе рубрыкаў. Дапамагае ўпарадкаваць зьмест, паказвае залежнасьці.

**Тэхніка змушаных асацыяцый -** спосаб аказу на пастаўленыя пытаньні (вырашэньне праблемы), пры дампамозк асацыяыяў, зьвязаных з выкарыстаньнем дадзеных прадметаў. Нп. можна напісаць, як трэба выкарыстоўваць кампутар, мяч, боты, каб Пётр прыходзіў пунктуальна на занятткі. Пасьля індывыдуальнай працы прыхозіць час на прэзэнтацыю ідэяў, групавы выбар найлепшага рашэньня.

**Тэст -** абьектыўная спроба дыягностыкі цікавячых нар рысаў пэўных прадметаў, выніікі каторай успрымаюцца колькасна. Тэст застасоўваецца з мэтай знаходжаньня адказу на канкрэтныя пытаньні. Можа складацца з заданьняў, пытаньняў, парадаў малюнкаў, ілюстрацый.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

**Складанкі** - мэтай цьвічэньня зьяўляецца ўкладаньне з рассыпаных элемэнтаў цэласнай і лягічнай схэмы (для ускладаньваньня можа не хапаць яко-небудзь элемэнту).

**Дапаўненьне сказаў** – заданьнем удзельнікаў заняткаў зьяўляецца скончыць распачаты сказ (кожны па чарзе выказвае канец сказа, альо запісвае свій адказ на паперы). Сканчэньне сказаў дапамагае удзельнікам пабачыць падобныя альбо розныя аспэкты ў сабе і іншых, калі яны кажуць а сваіх бачуцьцях ці рэакцыях, зьвязаных з заняткамі, здарэньнямі альбо праблемамі, выказацца на дадзеную тэму. Вядучаму можа даць шмат інфармацыі аб: стане ведаў удзельнікаў, іх самапачуцьці, можа даведацца іх меркаваньне на пэўную тэму. Дапаўненьне сказаў можа быць стасаванае як уводзіны ў дыскусію, албо напрыканцы заняткаў.

**Лекцыя** - вусная прэзэнтацыя выбранага зьместу, выконваецца выкладчыкам, каб падаць групе неабходную інфармацыю для выкарыстаньня пастаўленых заданьняў. Лекцыі выкарыстоўваюцца для вытлумачэньня агульных паняцьцяў і спэцыфікі тэматыкі, а таксама для матывацыі крытычнага мысьленьня.Правільна праведзеныя, у спалучэньні з іншымі мэтодыкамі навучаньня, робяць магчымым здабываньне інффармацыі, заангажаваньне і прастату навучаньня. Аднак, стасаваныя як асноўная мэтодыка даюць слабы вынік. Лекцыя павінна выкарыстоўвацца для дапамогі іншых дзеяньняў, каторыя сьхіляць удзельнікаў а актыўнага ўключэньня ў працэс навучаньня. Лекцыя можа быць стасаваная у кожным моманце навучаньня ля пабуджэньня мысьленьня, як уступ да практычных заняткаў, да скасаваньня непаразуменьняў. З другога боку, лекцыя можа быць застасаваная напрыканцы заняткаў, для падсумаваньня найважнейшых момантаў трансфэру ведаў.
Пасьпяховая лекцыя мусіць быць дакладна заплянаваная з увагай на тры аспэкты:
1. Зьяўляецца кароткай, канцэнтруецца на некалькіх ключавых момантах, мае акрэсьлены тэмп падаваньня інфармацыі у амераных прапорцыях.
2. Складаецца з обра заплянаванага, інтрыгуючага уступу, пераконваючай галоўнай часткі і моцнага выразнага канца.
3. Лекцыя дае слухачам магчымасьць актыўнага уключэньня ў працэс самаадукацыі.

**Звычайная лекцыя** – зьмест пераказваецца ў гатовай да запамінаньня форме.

**Праблемная лекцыя** - абапіраецца на пэўным пастаўленым аспэкце, указаньню шляхоў, што вядуць да яго рашэньня і наступстваў, якія могуць быць пасьля прыняцьця рашэньня.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

**Лекцыя-сэмінар** – ступень заангажаванасьці слухача ў падобнай форме найвышэйшая. Гэта перапляценьне словаў выкладчыка і ўдзельнікаў, каторыя выконваюць пэўныя заданьні для здабыцьця добрых навыкаў ў стасаваньні ведаў.

**Інтэрвію** – яго мэтай зьяўляецца атрыманьне, рэгістрацыя і пераказа меркаваньняў, інфармацый. Удзельнікі вучацца цягам гэтага працэсу разумецца у межах грамадзтва. Вядучы павінен дапамагчы пры стварэньні ясных і сьцісла зьвязаных з тэмай пытаньняў для інтэрвію і інтэрпрэтацыі атрыманых інфармацый.

**Гульня з гісторыяй** - усяму занятку можна даць якую-небудзь форму, якуюсьці галоўную думку – гэта можа быць альбо тэлеспаборніцтва (фамілiяа, кола фартуны і г.д.), тэлевізійная праграма (кава ці гарбата, сто пытаньняў да…), навуковая канфэрэнцыя, біржа. Удзельнікі уваходзяць у ролю, зьяўляюцца ўдзельнікамі, гледачамі, бяруць узел у конкурсах і пры апамозе гульні могуць атрымліваць, упарадкоўваць, сыстэматызаваць пэўныя веды, дасканаліць свае навыкі.

**За і супраць**- мэтодыка палягае на пошуку аргумэнтаў "за" дадзенай прапановай і "супраць" яе. Пры ацэнцы ідэяў гэтая мэтодыка дапамагае збудаваць табліцу, каторай акрасьленьнямі з канкрэтных калёнках: ідэя, аргумэнты "за", "супраць", дзеяньне-вынік. У апошняй калёнцы можна рабіць вынікі, ствараць пэўныя варыянты рашэньняў.

**Выведка** – збор інфармацыі на якуюсьці тэматыку, часта пасярод лбольшай лічбы асобаў і на шырэйшых тэрыторыях. Удзельнікі, выкрочваючы ў выведку, мусяць быць да яе падрыхтаваныя – ведаць, што хочуць пачуць, што мусяць даведацца, як павінныя сябе паводзіць. Калі ўдзельнікі мусяць атрымаць інфармацыю пры наведваньні якой-небудзь інстытуцыі – то напярэдадні варта дамовіцца з кіраўніцтвам. Выведку трэба падсумаваць.

Апрацавала: Іка Крэнчковска

*Публікацыя выражае толькі погляды аўтаркі і ня можа асацыявацца з афіцыйнай пазыцыяй Міністэрства Замежных Справаў РП.*



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.